**Галоўнае** – пераадоліць страх / падрыхт. Д. Раманоўскі // Патрыёт (Ушачы). — 2014. — 15 лют. — С. 4.

## ГАЛОЎНАЕ – ПЕРААДОЛІЦЬ СТРАХ



**За час гутаркі са мной слёзы двойчы заблішчэлі ў куточках вачэй ветэрана афганскай вайны Пятра Міхайлавіча Турчыновіча – калі прыгадаў нябожчыкаў бацькоў, якіх год назад давялося хаваць аднаго за адным праз чатыры дні, і калі расказваў аб загінуўшых баявых таварышах, пералічваў знаёмых воінаў-інтэрнацыяналістаў нашага раёна, якія пайшлі з жыцця ўжо пасля вяртання на радзіму. Для яго яны таксама як родныя…**

«Каб не хвароба – мы б з вамі зараз не размаўлялі: не засталі б мяне дома, бо вельмі рыбалку люблю – мабыць таму, што родам з Рыбакоў», – жартуе Пётр Міхайлавіч. Хоць і нарадзіўся ён у гэтай невялікай вёсцы, але лічыць сябе карэнным ушачанінам, бо сям’я пераехала ў райцэнтр, калі хлопчыку было толькі тры гады. Сярэдні з трох братоў, Пётр Міхайлавіч у 1984 годзе скончыў Ушацкую школу і падаў дакументы ў Полацкае ПТВ-28 нафтахіміі.

– Сябар падгаварыў, – успамінае мужчына. – Я дакументы завёз, а ён потым і не паехаў – «сачкануў».

Пасля вучылішча паспеў малады наладчык вымяральных прыбораў папрацаваць на «Паліміры». У армію прызываўся ў Наваполацку, пасля апошняй медкамісіі ў Віцебску «купцы» пасадзілі яго і яшчэ некалькіх хлопцаў у поезд і раніцай наступнага дня быў ён ужо ў Маскве… Мяняліся вакзалы і цягнікі. «Будзеце служыць у Сярэдняй Азіі», – успамінае словы салдатаў суправаджэння Пётр Міхайлавіч. Але да Ташкента, куды іх нібы спачатку планавалі везці, яны не даехалі – на станцыі Маргелан пераселі на аўтамабілі. Разуменне таго, што можа трапіць у Афганістан, прыйшло да П. Турчыновіча, калі даведаўся пра іх канчатковы пункт прызначэння – Фергану. Яшчэ перад арміяй ва Ушачах чуў ад родных свайго аднакласніка Алега Рагавешкі пра

трасу Фергана-Кабул. Так апісваў сваё месца службы ў пісьмах дадому яшчэ адзін ушацкі воін-інтэрнацыяналіст.

Месяцы «вучэбкі» праляцелі хутка. Назаўсёды ўрэзалася ў памяць пастраенне, падчас якога кожны з маладых салдат меў выбар – адмовіцца ад службы ў Афганістане і застацца ў Саюзе. З гонарам адзначае Пётр Міхайлавіч, што ніхто з яго прызыву гэтым правам не скарыстаўся.

Увечары перад адпраўкай «за рэчку» ён атрымаў паведамленне, што з дому прыйшла пасылка.

– Атрымаць яе не было ніякай магчымасці, – хвалюецца ад нахлынуўшых успамінаў мой суразмоўца. – У 6 гадзін раніцы нас чакалі «Уралы» для адпраўкі на аэрадром у Ташкент, а аддзяленне сувязі адкрывалася ў 9 гадзін. Пакінуў паведамленне хлопцам у часці і папрасіў адправіць тэлеграму маме: «Дзякуй, усё было вельмі смачна». Але ім пасылку без мяне не аддалі, а адправілі назад. Ліст ад маці я атрымаў ужо ў Кандагары, памятаю, як маркоціўся, што яна перажывае…

Закурваем і некалькі хвілін маўчым. У такія імгненні неяк асабліва разумееш, што аб вайне па-сапраўднаму можна даведацца толькі вось так – праз канкрэтныя лёсы, праз «дробязі», з якіх яны складаюцца.

– Ведаю аб чым хочаш далей спытаць, – парушае маўчанне Пётр Міхайлавіч. – Задавай пытанні, мне так лягчэй будзе ўспамінаць.

Службу ў Афганістане ён пачаў на «кропцы» радыётэлеграфістам, кажа «сядзеў у БТРы на сувязі». Каля 35 чалавек салдат, 6 афіцэраў, танк, 4 бронетранспарцёры, мінамёт «Васілёк», гаўбіца – іх пункт забяспечваў баявую ахову аўтадарогі, якая праходзіла зусім недалёка ад граніцы з Пакістанам. За два гады службы больш 10 разоў быў на баявых выездах. Даводзілася ўдзельнічаць у аперацыях па выратаванні пілотаў збітых верталётаў, трапляць пад абстрэл калон, якія іх БТРы суправаджалі. Дарэчы, у такіх баявых выездах мяняў радавы навушнікі радыётэлеграфіста на кулямёт. Бліжэйшым населеным пунктам да іх кропкі быў Кішкінахуд. У раёне гэтага буйнога кішлака да 1987 года не было выпадкаў, каб нашым калонам не даводзілася прарывацца з боем і не трэба было суправаджаць іх буйнымі сіламі.

У памяці Пятра Міхайлавіча ўсплывалі моманты і дэталі, якія па вялікаму рахунку і не патрэбна было ўваскрашаць.

– Калона трапіла ў засаду, – працягвае П.Турчыновіч. – Столькі гадоў прайшло, але і цяпер, калі ўспамінаю, перад вачыма стаіць, як выпушчаная «духамі» ракета перад нашым БТРам трапіла ў аўтамабіль з гаручым. Хлопец, які сядзеў за рулём, ахоплены полымем, вываліўся з кабіны і згарэў зажыва ў нас на вачах.

Усё было, але ж хіба можна ўсё расказаць… Гібель саслужыўцаў бачыў не раз, а вось яго кулі на шчасце міналі. Быў страх, канечне, даводзілася яго пераадольваць. Потым прывык, не думалася аб смерці. Калі выходзілі на заданне, заўсёды была надзея на добрае яго заканчэнне.

Гэта ўменне пераадолець сябе дазволіла Пятру Міхайлавічу здзейсніць учынак, за які ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Ноччу, калі рота паміж дзяжурствамі на «кропцы» знаходзілася ў размяшчэнні батальёна, маджахеды пачалі абстрэл.

– Я ў гэты час быў на тэрыторыі, пайшоў за дрывамі. Калі сталі рвацца снарады, прызнацца і не памятаю як апынуўся ва ўкрыцці, таварышы дапамаглі, бо ад нечаканасці на нейкія хвіліны

проста аслупянеў. Але калі камбат загадаў тушыць склад з боепрыпасамі, адразу кінуўся туды – загады не абмяркоўваюцца.

13 лістапада 1987 года радавы 70-ай асабовай мотастралковай брыгады Пётр Міхайлавіч Турчыновіч і яшчэ пяцёра яго таварышаў, скончыўшы чарговае баявое дзяжурства, пакінулі сваю «кропку» – іх чакала дарога дадому.

Адпрацаваўшы на «Паліміры» яшчэ год вярнуўся на радзіму, ва Ушачы, уладкаваўся на пілараму ў ПМК-66, а з 1992 года і па сённяшні дзень з'яўляецца работнікам ААТ «Ушачы». Прыпамінае Пётр Міхайлавіч недалёкі час, калі на гэтым прадпрыемстве працавала 8 афганцаў.

– Няма ўжо на гэтым свеце Мішы Міхаля, Грышы Клачка, Віці Пятніцы, і вось зусім нядаўна памёр Валодзя Клопаў, – пералічвае П.Турчыновіч. – Палова нас засталося з таго «асабовага складу». Вось успомніў зараз усё і думаю, што жыццё маё магло скласціся іншым чынам. На сённяшні дзень можа што і змяніў бы, ды час назад не вернеш. Адно скажу з упэўненасцю – ніколі б не прамяняў сваіх баявых таварышаў, а памятаць буду іх заўсёды – і тых, хто вярнуўся жывымі, і тых, хто загінуў там, «за рэчкай».

**Падрыхтаваў Д. Раманоўскі**